# Сталінская Канстытуцыя—сцяг нашых перамог

**В. І. КАЗЛОЎ**

Пятнаццаць год таму назад, 5 снежня 1936 года, Надзвычайны VIII Усесаюзны з'езд Саветаў прыняў новую Канстытуцыю СССР — Асноўны Закон савецкай сацыялістычнай дзяржавы, які ўвасабляе сабой гістарычныя заваёвы нашага гераічнага народа, веліч савецкага ладу. Савецкі народ назваў новую Канстытуцыю Сталінскай, па імені яе геніяльнага творца.

Сталінская Канстытуцыя — Канстытуцыя перамогшага сацыялізма. У ёй законадаўча замацавана перамога сацыялізма ў нашай краіне, заваяваная савецкім народам пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, пад вадзіцельствам нашага вялікага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Сталінская Канстытуцыя замацавала той сусветна-гістарычны факт, што СССР уступіў у паласу завяршэння будаўніцтва сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комунізма. У чэканных словах гэтага гістарычнага дакумента законадаўча адлюстравана ўсё тое, што здабыта і заваявана грамадзянамі СССР за гады Савецкай улады. Сталінская Канстытуцыя ўвасобіла ў сваіх артыкулах спадзяванні і імкненні савецкага народа, яна з'яўляецца самай дэмакратычнай канстытуцыяй свету.

У сваім гістарычным дакладзе аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР таварыш Сталін ахарактарызаваў новую Канстытуцыю, як «гістарычны дакумент, які трактуе проста і сцісла, амаль у пратакольным стылі, аб фактах перамогі сацыялізма ў СССР, аб фактах вызвалення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, аб фактах перамогі ў СССР разгорнутай, да канца паслядоўнай дэмакратыі» [1].

У дакладзе на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Саветаў аб праекце новай Канстытуцыі 25 лістапада 1936 года таварыш Сталін падвёў вынікі палітычнага і эканамічнага развіцця савецкага грамадства за перыяд з 1924 па 1936 год, паказаў сутнасць змен, якія адбыліся з таго часу ў эканоміцы, у класавай структуры нашага грамадства, у нацыянальных узаемаадносінах, а таксама з выключнай сілай раскрыў асаблівасці Савецкай Канстытуцыі, яе карэннае адрозненне ад канстытуцый буржуазных краін, яе сапраўды народны, да канца паслядоўны сацыялістычны дэмакратызм, яе велізарнейшае значэнне для працоўных СССР і ўсяго свету.

Даклад таварыша Сталіна «Аб праекце Канстытуцыі СССР», як і сама Канстытуцыя, належыць да ліку выдатных твораў большэвіцкай думкі і з'яўляецца каштоўнейшым укладам у скарбніцу марксізма-ленінізма. Геніяльна абгрунтоўваючы ў гэтым дакладзе праект новай Канстытуцыі, таварыш Сталін развіў далей марксізм-ленінізм, узбагаціўшы яго новымі палажэннямі аб сацыялістычным грамадстве, сацыялістычнай дзяржаве і яе ролі ў пераходную эпоху ад капіталізма да комунізма ва ўмовах капіталістычнага акружэння, даў глыбокі аналіз змен, якія адбыліся

[1] І. Сталін. Пытанні ленінізма, выд. 11, стар. 533.

ў гаспадарчым і грамадска-палітычным жыцці СССР, ускрыў новыя адносіны, якія ў выніку перамогі соцыялізма стварыліся паміж класамі, а таксама паміж нацыямі совецкага грамадства, паказаў велізарныя перавагі совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу.

К 1936 году, калі была прынята Сталінская Канстытуцыя, у нашай краіне адбыліся велізарныя змены ў эканамічнай і класавай структуры совецкага грамадства. Мудрая ленінска-сталінская палітыка індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі ператварыла нашу краіну ў перадавую і самую магутную індустрыяльна-калгасную соцыялістычную дзяржаву. Грамадская ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці зацвердзілася ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі як непарушная аснова совецкага ладу. Соцыялізм моцна ўвайшоў у штодзенны быт совецкага народа. Беззваротна адыйшлі ў нябыт эксплаатацыя, беспрацоўе, разарэнне, галеча працоўных. Усе эксплаататарскія класы ў нашай краіне былі ліквідаваны.

Совецкае грамадства складаецца цяпер з двух дружаственных, зусім новых, вызваліўшыхся ад эксплаатацыі класаў — рабочых і сялян, разам з якімі, «у адной запрэжцы з імі», ідзе ўперад да перамогі комунізма новая, совецкая інтэлігенцыя, якая ўсімі карэннямі звязана з рабочым класам і сялянствам.

Велізарныя змены ў галіне народнай гаспадаркі і ў класавай структуры совецкага грамадства суправаджаліся далейшым умацаваннем брацкай дружбы народаў СССР.

У выніку няўхільнага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы дапамозе вялікага рускага народа былыя адсталыя ўскраіны царскай Расіі за гады совецкай улады ператварыліся ў квітнеючыя соцыялістычныя рэспублікі з высока развітымі прамысловасцю, сельскай гаспадаркай і культурай. Пераўтвораныя карэнным чынам старыя нацыі Расіі ператварыліся ў соцыялістычныя нацыі вялікага Совецкага Саюза, звязаныя непарушнай дружбай.

Характарызуючы брацкае супрацоўніцтва, што ўстанавілася паміж народамі СССР, таварыш Сталін у сваім гістарычным дакладзе аб праекце Канстытуцыі ўказваў: «Адсутнасць эксплаататарскіх класаў, якія з'яўляюцца асноўнымі арганізатарамі міжнацыянальнай калатні; адсутнасць эксплаатацыі, якая культывіруе ўзаемнае недавер'е і распальвае нацыяналістычныя страсці; наяўнасць ва ўладзе рабочага класа, які з'яўляецца ворагам усякага заняволення і верным носьбітам ідэй інтэрнацыяналізма; фактычнае ажыццяўленне ўзаемнай дапамогі народаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і грамадскага жыцця; урэшце, росквіт нацыянальнай культуры народаў СССР, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу, — усе гэтыя і падобныя ім фактары прывялі да таго, што змянілася ў корані аблічча народаў СССР, знікла ў іх пачуццё ўзаемнага недавер'я, развілося ў іх пачуццё ўзаемнай дружбы і наладзілася, такім чынам, сапраўднае брацкае супрацоўніцтва народаў у сістэме адзінай саюзнай дзяржавы».

Сталінская Канстытуцыя — гэта Канстытуцыя вялікага супрацоўніцтва народаў СССР. У ёй усебакова і паслядоўна выражаны прынцыпы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі і ў законадаўчым парадку замацаваны дасягнутыя ў нашай краіне поспехі гэтай палітыкі.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка Совецкага Саюза і вялікая дружба народаў выражаны і ў дзяржаўнай будове СССР, які ажыццявіў добраахвотнае аб'яднанне роўнапраўных совецкіх соцыялістычных рэспублік — дзяржаўны саюз народаў. Непарушная дружба народаў

СССР з'яўляецца адной з асноўных сіл совецкага грамадства, адной з крыніц сілы і магутнасці нашай совецкай дзяржавы.

Вялікая Айчынная вайна з асаблівай сілай прадэманстравала перад усім светам усю веліч непарушнай дружбы і брацтва паміж народамі, якія насяляюць вялікі Совецкі Саюз, паказала жыццёвасць совецкай многанацыянальнай дзяржавы і яе перавагу над любой буржуазнай дзяржавай. «Цяпер, — указваў таварыш Сталін у сваім выступленні перад выбаршчыкамі 9 лютага 1946 года, — гутарка ідзе ўжо не аб жыццездольнасці совецкага дзяржаўнага ладу, бо яго жыццездольнасць не падлягае сумненню. Цяпер гутарка ідзе аб тым, што совецкі дзяржаўны лад аказаўся ўзорам многанацыянальнай дзяржавы, што совецкі дзяржаўны лад прадстаўляе такую сістэму дзяржаўнай арганізацыі, дзе нацыянальнае пытанне і праблема супрацоўніцтва нацый вырашаны лепш, чым у любой іншай многанацыянальнай дзяржаве».

* * *

У дакладзе аб праекце Канстытуцыі СССР таварыш Сталін паказаў сапраўдны дэмакратызм Совецкай Канстытуцыі, глыбока і ўсебакова раскрыў яе прынцыповае адрозненне ад канстытуцый буржуазных дзяржаў.

Канстытуцыя СССР упершыню ў гісторыі чалавецтва не абвяшчае фармальна тыя ці іншыя прынцыпы або правы грамадзян, якіх няма ў сапраўднасці, як гэта робяць буржуазныя канстытуцыі, а прадстаўляе сабой вынік пройдзенага шляху, — устанаўляе поўную адпаведнасць абвяшчаемых правоў і прынцыпаў з тым, што ёсць у рэчаіснасці. Канстытуцыі буржуазных краін замацоўваюць у законадаўчым парадку прынцыпы капіталізма, прыватную ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, эксплаатацыю чалавека чалавекам, незабяспечанасць працоўнай большасці і раскошу непрацуючай паразітычнай меншасці. Усемагчымыя сцверджанні буржуазіі і яе апалагетаў аб буржуазнай «свабодзе» і «дэмакратыі» служаць толькі шырмай, прыкрыццём эксплаататарскай сутнасці буржуазнай дзяржавы.

У Сталінскай Канстытуцыі адлюстраваны асноўныя прынцыпы, устоі соцыялізма: соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, ліквідацыя эксплаатацыі і паразітычных класаў, ліквідацыя беспрацоўя і знішчэнне галечы мас, права ўсіх грамадзян на атрыманне работы і іх абавязак працаваць у адпаведнасці з соцыялістычным прынцыпам: «Хто не працуе, той не есць».

Сталінская Канстытуцыя ў адрозненне ад канстытуцый буржуазных дзяржаў не ўтойвае сваёй класавай сутнасці. У артыкуле I Канстытуцыі СССР указваецца: «Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік ёсць соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян». Уся ўлада ў СССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Советаў дэпутатаў працоўных, а дзяржаўнае кіраўніцтва грамадствам належыць рабочаму класу, як перадавому класу грамадства. Канстытуцыя СССР законадаўча замацоўвае парадкі, выгадныя працоўным.

Канстытуцыі буржуазных дзяржаў замацоўваюць парадкі, патрэбныя і выгадныя пануючаму класу, кучцы эксплаататараў. Яны выражаюць класавыя эгаістычныя інтарэсы кіруючай меншасці. Таму буржуазія і яе ідэолагі ўсяляк спрабуюць утоіць класавую прыроду канстытуцый буржуазных дзяржаў. З мэтай абману працоўных мас буржуазныя канстытуцыі многа гавораць аб «народзе», аб «агульным добрабыце», аб «свабодзе, роўнасці і брацтве». Усе гэтыя пышныя словы з'яўляюцца не чым іншым, як маскіроўкай, разлічанай на абман мас.

«Буржуазныя канстытуцыі, — указвае таварыш Сталін, — звычайна абмяжоўваюцца фіксаваннем фармальных правоў грамадзян, не клапоця-

чыся аб умовах ажыццяўлення гэтых правоў, аб магчымасці іх ажыццяўлення, аб сродках іх ажыццяўлення. Гавораць аб роўнасці грамадзян, але забываюць, што не можа быць сапраўднай роўнасці паміж гаспадаром і рабочым, паміж памешчыкам і селянінам, калі ў першых ёсць багацце і палітычная вага ў грамадстве, а другія пазбаўлены і таго і другога, калі першыя з'яўляюцца эксплаататарамі, а другія эксплаатуемымі. Або яшчэ: гавораць аб свабодзе слова, сходаў і друку, але забываюць, што ўсе гэтыя свабоды могуць ператварыцца для рабочага класа ў гук пусты, калі ён пазбаўлены магчымасці мець у сваім распараджэнні адпаведныя памяшканні для сходаў, добрыя друкарні, дастатковую колькасць друкаванай паперы і г. д.» [1].

У краінах імперыялізма ўсяляк выганяюцца, ліквідуюцца апошнія рэшткі дэмакратыі, буржуазія пераходзіць да ўсё больш адкрытых, тэрарыстычных метадаў дзяржаўнага кіраўніцтва. Гэта асабліва ярка відаць на прыкладзе Злучаных Штатаў Амерыкі. Канстытуцыя ЗША, прынятая яшчэ ў XVIII стагоддзі, даўно стала фікцыяй. На словах амерыканская канстытуцыя абвяшчае роўнасць грамадзян, багатых і бедных, капіталістаў і рабочых. Аднак усімі гэтымі правамі карыстаюцца толькі капіталісты, а рабочыя масы вымушаны ісці ў наёмнае рабства да капіталістаў, знаходзіць прытулак у трушчобах і халупах, жыць упрогаладзь, плаціць непасільныя падаткі.

ЗША — краіна жорсткай эксплаатацыі працоўных, росту галечы, дзікага рабства, самавольства і гвалту. В. І. Ленін у 1918 годзе ў «Пісьме да амерыканскіх рабочых» пісаў, што: «Амерыка стала разам з тым адной з першых краін па глыбіні бяздоння паміж жменькай абнаглелых мільярдэраў, якія захлёбваюцца ў брудзе і ў роскашы, з аднаго боку, і мільёнамі працоўных, якія вечна жывуць на мяжы галечы, з другога» [2]. Штогадовы прыбытак у 92% амерыканскіх сямей намнога меншы таго, што неабходна мець, каб не памерці з голаду. Рады беспрацоўных у ЗША няспынна павялічваюцца ў выніку згортвання грамадзянскіх галін прамысловасці, выкліканага шалёнай гонкай узбраенняў. Зараз у ЗША налічваецца звыш 20 мільёнаў беспрацоўных і поўбеспрацоўных. Амерыканскі рабочы жыве з дня ў дзень пад страхам звальнення з работы, бо, страціўшы работу, другую ён знайсці не можа.

Аналагічнае становішча мае месца і ў іншых капіталістычных краінах. У маршалізаванай Італіі налічваецца каля 4,5 мільёна беспрацоўных, каля 3 мільёнаў у Заходняй Германіі і г. д.

У гутарцы з Рой Говардам таварыш Сталін гаварыў: «Мне цяжка ўявіць сабе, якая можа быць «асабістая свабода» ў беспрацоўнага, які ходзіць галодным і не знаходзіць прымянення сваёй працы. Сапраўдная свабода ёсць толькі там, дзе знішчана эксплаатацыя, дзе няма прыгнечання адных людзей другімі, дзе няма беспрацоўя і галечы, дзе чалавек не дрыжыць за тое, што заўтра можа страціць работу, жыллё, хлеб. Толькі ў такім грамадстве магчыма сапраўдная, а не папяровая, асабістая і ўсякая іншая свабода».

У Савецкай дзяржаве ў выніку сацыялістычнай рэвалюцыі і перамогі сацыялізма ўпершыню ў гісторыі права на працу ажыццёўлена на справе. Праца ў нашай краіне ператварылася ў справу чэсці, справу славы, справу доблесці і геройства.

У артыкуле 118 Канстытуцыі Саюза ССР гаворыцца: «Грамадзяне СССР маюць права на працу, гэта значыць права на атрыманне гарантаванай работы з аплатай іх працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якас-

---

[1] **І. Сталін.** Пытанні ленінізма, выд. 11, стар. 517.

[2] **Ленін.** Творы, т. 28, стар. 25.

цю». Гэта азначае, што кожны, без выключэння, здольны да працы грамадзянін СССР можа атрымаць у сваёй краіне работу, што кожнаму грамадзяніну не толькі забяспечана прымяненне яго сіл у прадукцыйнай працы, але і аплата працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю. Гэта азначае, што грамадзянін СССР забяспечан ад усякага самавольства ў справе аплаты яго працы, што дзяржава строга ахоўвае крыніцу яго сродкаў існавання, гарантуючы справядлівую аплату працы.

У Савецкім Саюзе няма і не можа быць беспрацоўя. У пасляваенны перыяд штогод, у сярэднім на 2 мільёны чалавек, расце колькасць рабочых і служачых, занятых у народнай гаспадарцы. Савецкія людзі, ажыццяўляючы свае права на працу, правільна бачаць у ёй не толькі гарантыю ад галечы, ад беспрацоўя, не толькі забяспечанне кожнаму магчымасці палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, але і гарантыю актыўнага ўдзелу ва ўмацаванні сацыялістычнай дзяржавы, ва ўздыме ўсёй краіны на новую, вышэйшую ступень, у прасоўванні ўперад да камунізма.

Сталінская Канстытуцыя гарантуе грамадзянам СССР права на адпачынак. У артыкуле 119 Канстытуцыі гаворыцца:

«Права на адпачынак забяспечваецца ўстанаўленнем для рабочых і служачых васьмігадзіннага рабочага дня і скарачэння рабочага дня да сямі і шасці гадзін для раду прафесій з цяжкімі ўмовамі работы і да чатырох гадзін — у цэхах з асабліва цяжкімі ўмовамі работы; устанаўленнем штогодных адпускоў рабочым і служачым з захаваннем заработнай платы; прадастаўленнем для абслугоўвання працоўных шырокай сеткі санаторыяў, дамоў адпачынку, клубаў».

Сталінская Канстытуцыя патрабуе строгага захавання ўстаноўленай працягласці рабочага дня рабочых і служачых з тым, каб ім быў забяспечаны нармальны адпачынак.

У буржуазных краінах працягласць рабочага дня залежыць ад волі капіталістаў, а закон, які стаіць на стражы інтарэсаў буржуазіі, дазваляе выкарыстаць рабочых і служачых так, як гэта выгадна ўладару прадпрыемства. Працоўныя капіталістычных краін падвяргаюцца бязлітаснай эксплаатацыі з боку фабрыкантаў, заводчыкаў і іншых дармаедаў.

У сучаснай Англіі працягласць рабочага дня не абмежавана ніякім законам. Не абмежавана працягласць рабочага дня большасці рабочых трумэнаўскай Амерыкі. У Аргентыне, Чылі і іншых краінах капітала рабочы дзень батракоў дасягае 14 — 16 гадзін.

Сталінская Канстытуцыя гарантуе грамадзянам СССР права на матэрыяльнае забяспечанне ў старасці, а таксама ў выпадку хваробы і страты працаздольнасці. Гэта права забяспечваецца шырокім развіццём сацыяльнага страхавання рабочых і служачых за кошт дзяржавы, бясплатнай медыцынскай дапамогай працоўным, прадастаўленнем у іх карыстанне шырокай сеткі курортаў.

Савецкая дзяржава клапоціцца аб старых і інвалідах. Пенсіі па старасці прызначаюцца пажыццёва. Яны ўстанаўляюцца ўсім рабочым і служачым па дасягненні пэўнага ўзросту і пры наяўнасці адпаведнага працоўнага стажу. Пенсія выплачваецца і ў тым выпадку, калі пенсіянер працягвае працаваць.

Вялікая работа праводзіцца па абслугоўванню інвалідаў. Савецкая дзяржава не толькі забяспечвае іх пенсіяй, але і дае магчымасць авалодаць новымі прафесіямі, займацца пасільнай працай. Інвалідам прадастаўляюцца ільготы пры атрыманні пуцёвак у санаторыі, дамы адпачынку і г. д.

У нашай краіне матэрыяльная дапамога аказваецца ўсім працоўным горада і вёскі. У калгасах, згодна Сталінскаму статуту сельскагаспадарчай арцелі, ствараецца фонд дапамогі інвалідам, старым, часова страціў-



Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

шым працаздольнасць за кошт адлічэння да двух процантаў валавога прыбытку калгаса.

Іншая справа ў капіталістычных краінах. Прадпрыемцу не патрэбен пастарэлы, хворы чалавек. Яго цікавіць толькі адно — выціснуць з рабочага як мага больш прыбытку. Аддаўшы ўсё жыццё працы на іншых, рабочыя капіталістычных краін у старыя гады або пры інваліднасці вымушаны паміраць у галечы, ад голаду і хвароб.

Сталінская Канстытуцыя абвяшчае і замацоўвае на справе права ўсіх грамадзян СССР на адукацыю. Гэта права забяспечваецца ўсеагульнаабавязковай пачатковай адукацыяй, бясплатнасцю сямігадовай адукацыі, сістэмай дзяржаўных стыпендый выдатнікам вучобы ў вышэйшай школе, навучаннем у школах на роднай мове, арганізацыяй на заводах, у соўгасах, машынна-трактарных станцыях і калгасах бясплатнага вытворчага, тэхнічнага і агранамічнага навучання.

Колькасць вучняў у нашай краіне расце з года ў год. У 1950 годзе колькасць вучняў у пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школах, тэхнікумах і іншых сярэдніх навучальных установах складала 37 мільёнаў. У вышэйшых навучальных установах навучалася 1 мільён 247 тысяч студэнтаў.

Дзякуючы таму, што грамадзяне СССР маюць гарантаванае права на адукацыю, у нашай краіне бесперапынна ўзрастае колькасць асоб, атрымаўшых сярэднюю і вышэйшую адукацыю, павышаецца агульны адукацыйны ўзровень насельніцтва. Толькі за пасляваенную пяцігодку народная гаспадарка нашай краіны атрымала 652 тысячы спецыялістаў з вышэйшай і 1 мільён 278 тысяч з сярэдняй адукацыяй. У СССР шырока ажыццёўлена атрыманне агульнай і спецыяльнай адукацыі без адрыву ад вытворчасці. Створана сетка агульнаадукацыйных школ для дарослых, дзе рабочыя і калгаснікі ў вольны ад работы час атрымліваюць адукацыю.

У буржуазных краінах адукацыя для працоўных недаступна. У ЗША — краіне, якая фанабэрыцца сваёй «цывілізацыяй» — на 75 мільёнаў дарослага насельніцтва прыпадае 20 мільёнаў непісьменных. Штогод 6 мільёнаў дзяцей, або 20 процантаў усіх дзяцей школьнага ўзросту, не вучыцца, бо навучанне ў школах платнае і абыходзіцца вельмі дорага. Матэрыяльныя ўмовы жыцця працоўных у ЗША такія, што толькі нямногія могуць пасылаць сваіх дзяцей у школу. Усё гэта прамы вынік палітыкі трумэнаўскага ўрада, занятага нястрымнай гонкай узбраенняў. ЗША звыш 75 процантаў свайго бюджэту трацяць на ўзбраенне і толькі 1 процант на патрэбы асветы. Ва Францыі на ўтрыманне паліцыі выдаткоўваецца сродкаў у 3 разы больш, чым на народную асвету. У Англіі спынена будаўніцтва новых школ, а ў існуючых плата за навучанне настолькі высокая, што 80 процантаў англійскіх дзяцей вымушаны пакінуць навучанне ў школе. Працоўным буржуазных краін фактычна закрыт доступ у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі